*Е.А.Шишкова*

## Да пытання аб сацыялізуючай функцыі бібліятэкі

Па пытанні аб сутнасці зместу і аб’ёму сацыялізуючай функцыі ў бібліятэказнаўстве існавалі і існуюць некалькі пунктаў гледжання. Найбольш шырокае разуменне гэтай функцыі выказвалі ў сваіх працах такія бібліятэказнаўцы як У.Р.Фірсаў[1], Ю.П.Мяленц'ева[2], М.С.Карташоў[3]. Напрыклад, У.Р.Фірсаў сцвярджае, што сацыялізацыя – гэта развіццё асноўных бакоў дзейнасці чалавечай асобы, гэта значыць задавальненне яго пазнавальных, каштоўнасна-арыентацыйных і камунікатыўных патрэбнасцей[4]. Ён зводзіць сутнасныя функцыі бібліятэкі да пазнавальнай, каштоўнасна-арыентацыйнай і камунікатыўнай. У сукупнасці яны могуць задавальняць грамадскія патрэбнасці ў сацыялізацыі індывідаў. Сутнасныя сацыяльныя функцыі бібліятэкі канкрэтызуюць яе сацыяльную ролю як інстытута сацыялізацыі, і бібліятэка, такім чынам, выконвае асноўнае прызначэнне як сацыяльны інстытут – умацаванне грамадскай сістэмы і развіццё асобы, а гэта значыць сацыялізацыю[5]. Вучоны зразумеў, што пералічаныя функцыі не з’яўляюцца спецыфічнымі толькі для бібліятэкі, таму ён дакладна вызначыў іх спецыфіку ў дзейнасці бібліятэк, звязаную галоўным чынам з арганізацыяй грамадскага кнігавыкарыстання, гэта значыць сродкамі інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк[6]. Пералічаныя раней сутнасныя функцыі, на думку вучонага, канкрэтызуюцца ў вялікай колькасці вытворных, менавіта: пазнавальная функцыя выступае ў формах адукацыйнай, культурна-асветніцкай, інфармацыйнай, падфункцыі дапамогі навукова-тэхнічнаму прагрэсу і інш.; каштоўнасна-арыентацыйная – ў ідэалагічнай, выхаваўчай, эстэтычнай, геданістычнай і інш.[7]. Абедзьве функцыі немагчымы без камунікацыі. «Менавіта гэта пастаяннае ўзаемадзеянне ўсіх трох функцый, – сцвярджае У.Р.Фірсаў, – дазваляе разглядаць любую бібліятэку як інстытут сацыялізацыі[8]».

Выдатны расійскі бібліятэказнавец М.С.Карташоў таксама схіляўся да думкі, што «бібліятэка – гэта доўгатэрміновы інстытут сацыялізацыі, які пастаянна дзейнічае на працягу таго перыяду, пакуль чалавек уваходзіць ў лік яе чытачоў»[9]. Вучоны лічыў, што бібліятэцы належыць вельмі важная роля ў працэсе сацыялізацыі асобы, так як нараўне з іншымі ўстановамі яна дапамагае індывіду праз крыніцы інфармацыі засвоіць каштоўнасці і нормы, якія характэрны для дадзенай грамадскай фармацыі або сацыяльнай структуры. Больш таго, ён быў перакананы, што бібліятэка валодае шэрагам пераваг у параўнанні з іншымі ўстановамі, якія ўдзельнічаюць ў працэсе сацыялізацыі. Яе ўдзел у гэтым працэсе не мае абмежавання ў часе і даступнасці і ажыццяўляецца не на ўзроўні вялікіх груп, масы, а, як правіла, на індывідуальным ўзроўні[10].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліятэказнавец Ю.П.Мяленц'ева пры распрацоўцы пытанняў аб ролі бібліятэк у абслугоўванні юнацтва таксама прытрымлівалася пункту гледжання, што бібліятэка з’яўляецца інстытутам сацыялізацыі асобы[11].

Такое шырокае разуменне функцыі сацыялізацыі ў бібліятэцы было выказана бібліятэказнаўцамі ў 80-х – 90-х гг. ХХ ст., але яно не атрымала прызнання бібліятэчнай грамадскасці ў далейшым. Бібліятэказнаўцы, характарызуючы дадзеную функцыю, не зводзілі яе да вузкай сацыяльнай ролі. Напрыклад, І.А.Акмаева выказала думку, што бібліятэка садзейнічае сацыялізацыі, выконваючы галоўную яе місію[12], а К.Ю.Геніева адносіць функцыю сацыялізацыі да фундаментальнай функцыі[13]. Г.Паршукова перакананa, што сацыялізуючая функцыя прызвана аб’ядноўваць сацыяльны арганізм за кошт агульнасці ўяўленняў аб свеце, ствараць аснову для ажыццяўлення сацыяльнай камунікацыі[14].

У дачыненні да бібліяграфіі В.А.Факееў трактуе сацыялізуючыя функцыі як мадыфікацыю функцыянальнай бібліяграфічнай каштоўнаснай арыентацыі, прыгэтым варта заўважыць, што ён выкарыстоўвае тэрмін не ў адзіночным ліку, а ў множным: «социализирующие функции», да якіх ён адносіць «педагагічную, с падфункцыямі вучэбна-дапаможнай і адукацыйнай, папулярызатарскую, прапедэўтычную, бібліятэрапеўтычную»[15].

Разгледзеўшы розныя пункты гледжання бібліятэказнаўцаў адносна роляў, значэння і функцыі сацыялізацыі, узнікае пытанне: чым вызвана такая разнастайнасць думак? На наш погляд, пры вызначэнні тэрміна «сацыяльныя функцыі бібліятэкі» навукоўцы не ўлічвалі існаванне ў бібліятэчнай справе розных тыпаў і відаў бібліятэк. Сапраўды, калі для публічных бібліятэк сацыялізуючая функцыя з’яўляецца прыярытэтнай, а сам тып бібліятэк сапраўды можна аднесці да інстытута сацыялізацыі, то для навуковых, навукова-тэхнічных і іншых бібліятэк гэта функцыя з’яўляецца адной з радавых.

Да такой высновы, па сутнасці, прыйшла Т.Ф.Берастава, якая адзначала, што сацыялізуючая функцыя бібліятэчнага інстытута стала прыярытэтнай са з’яўленнем публічных бібліятэк і сёння яна знаходзіцца ў адной плоскасці з навуковай, вытворчай і адначасова з’яўляецца абагульняючай у адносінах да прапагандысцкай, самаадукацыйнай, вучэбнай, дасугавай і да падобных функцый[16].

Такім чынам, у сувязі з гэтай акалічнасцю, нам падаецца дакладнай думка Н.В.Жадзько, што сацыялізацыя, нараўне з інфармацыяй і адукацыяй, – гэта гістарычна складзены напрамак дзейнасці бібліятэк, які ў бібліятэказнаўстве лічаць функцыяй бібліятэкі[17].

[1]Фирсов В.Р. Социальная роль – социальные функции – библиотечная деятельность. Проблема принципа ограничения // Методологические аспекты изучения процессов функционирования библиотечных систем : сб. науч. тр. Ленинград, 1982. С. 21–36.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[2]Мелентьева Ю.П. Роль библиотеки в социализации читателя юношеского возраста : лекция. Москва, 1990. 31 с.

[3]Карташов Н.С., Скворцов В.В. Общее библиотековедение : учеб.: в 2 ч. Москва : Изд-во МГУК, 1997. Ч. 2. 256 с.

[4]Фирсов В.Р. Сущностные функции библиотечной деятельности. Культурологический подход // Научные и технические библиотеки СССР. 1985. № 5. С. 17.

[5]Там же. С. 19.

[6]Там же.

[7]Там же.

[8]Там же.

[9]Карташов Н.С., Скворцов В.В. Общее библиотековедение. С. 11.

[10]Там же. С. 11–12.

[11]Мелентьева Ю.П. Роль библиотеки в социализации читателя …

[12]Акмаева И.А Библиотека по соседству : друг, помощник, наставник // Библиотечное дело. 2012. № 11. С. 38.

[13]Гениева Е.Ю. Библиотека как центр межкультурной коммуникации. Москва : Росспрэн, 2005. 207 с.

[14]Паршукова Г. Власть над культурным пространством: библиотека в системе социальных коммуникаций // Библиотечное дело. 2009. № 7. С. 17.

[15]Фокеев В.А. Библиография: теоретико-методологические основания : учеб. пособ. для системы дополнительного библиотечно-информационного образования. Санкт-Петербург : Профессия, 2006. 250 с.

[16]Берестова Т.Ф. Общедоступная муниципальная библиотека в едином информационном пространстве. Москва : Либерея-Бибинформ, 2005. С. 98.

[17]Жадько Н.В. Статус и функции библиотеки // Научные и технические библиотеки. 1994. № 3. С. 9 ; Ее же. Анализ сущностных характеристик библиотеки как социокультурного института // Библиотековедение. 1996. № 3. С. 64.

*А.А.Юдин*

## Приметы экземпляра старопечатного кириллического издания и задачи локализации частных книжных собраний*

При изучении книжных памятников кириллической печати исследователь сталкивается с непременным атрибутом книги – характерными особенностями, присущими только конкретному экземпляру, вызванными читательским либо владельческим интересом. К приметам такого рода можно отнести записи, рисунки, пометы, закладки, особенности украшения переплета и т. д. То есть приметами экземпляра можно считать те признаки, которые книга приобретает с момента выхода из типографии. Комплекс данных признаков мы будем называть приметами экземпляра.

В существующих каталогах книг кириллической печати не всем приметам уделяется равное внимание. Важную роль при описании исследователи отводят записям, в меньшей степени (из-за слабо

*Работа выполнена при финансовой поддержке РГНФ проект № 12-04-00318а.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ